№29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Лявон Карповіч: Філатэлістычная Скарыніяна**

Анатацыя. Не гледзячы на веліч чыну Францішка Скарыны ў Беларусі пачалі казаць аб ім толькі ў 1920-я гады. З таго часу яго жыццё і асветніцкая дзейнасць адлюстраваны ў навуковых працах, жывапісу, тэатры і кіно…, таксама ў мастацкай разнастайнасці філатэлістычных мініяцюр. Але філатэлістычнай Скарыніяне прысвечаны толькі адзін артыкул знакамітага філатэліста Льва Коласава « Гений, зашифрованный в марках», надрукаваны ў «Весніку сувязі» № 3 (143) 2017. Гэты артыкул не поўны, не ахоплівае эміграцыйныя выданні і выданні апошніх гадоў і надрукаваны на расейскай мове. Таму аўтар вырашыў раскрыць тэму больш поўна і на Беларускай мове. Змест можа зацікавіць калекцыянераў і тых, хто неабыякавы да гісторыі краіны, жыцця і дзейнасці Францішка Скарыны, некаторых напрамкаў дзейнасці Беларускай дыяспары.

Вясною 1520 Францішак Скарына, наладаваўшы фуры ўсім неабходным для тыпаграфскай справы, вырушыў ад выязных варот Прагі да ўязных варот Вільні… У Празе чума і скончыліся грошы. Але ці гэта галоўная прычына ад'езду? Скарына лічыў што і Полацк і Вільня зачакаліся яго, як і ён сумаваў і марыў аб Радзіме. Марыў у Вільні пачаць з музыкі і залатарогага аленя шчасця. Ён будзе ў Вільні друкаваць-цiснуць акафісты, каноны, каб спявалі гусляры, дзяўчаты і хлопцы, а яшчэ падарожнікі, дастаўшы з кішэні Малую падарожную кніжку. Праз два гады ў 1522 Скарына трымаў у руках сваю мару. Малая падарожная кніжка гатова! З гэтай нагоды лідарка дэмакратычных сіл Святлана Ціханоўская разам з Беларускай Радай Культуры абвесцілі 2022 – Годам Скарыны.

Ішоў час і на нашыя землі абрынуліся знішчальныя беды. Найбольшая з іх – МАСКОЎСКІ КРЫВАВЫ ПАТОП – НЕВЯДОМАЯ ВАЙНА 1654-1667. Колькасць насельніцтва краіны скарацілася больш як удвая – з 2,9 да 1,4 млн. чалавек. Спатрэбілася 125 гадоў, каб насельніцтва Беларусі дасягнула ўзроўню сярэдзіны XVII ст. Пра Скарыну амаль на 300 гадоў забыліся. І толькі ў пачатку XX стагоддзя ў Празе чэшскі славіст Ёзэф Даброўскі вярнуў імя Скарыны для грамадства. У Беларусі пачалі казаць аб Скарыну толькі ў 1920-я гады. З таго часу яго жыццё і асветніцкая дзейнасць адлюстраваны ў навуковых працах, жывапісу, тэатры і кіно…, таксама ў мастацкай разнастайнасці філатэлістычных мініяцюр.

Вельмі сімвалічным з'яўляецца выданне першай Беларускай маркі менавіта з партрэтам Скарыны. Для незаангажаванага чалавека такая падзея, як выданне першай паштовай маркі краіны, выглядае нязначнай, бо ён не ведае, што гэты маленькі кавалачак паперы – паштовая марка – уводзіць краіну ў каталогі цэлага свету, становіцца сімвалам трываласці народу, сведчаннем яго існавання. Таму

№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

з'яўленне ў 1918 г. нават па-за межамі краіны першай беларускай маркі ёсць сапраўды значнай падзеяй у складанай і трагічнай гісторыі нашага народу ў ХХ ст. Эміграцыйны даследнік Вітаўт Тумаш у лісце да ўладыкі Васіля (Тамашчыка) ад 10 траўня 1969 г. пісаў: «Як вядома, першая паштовая марка з партрэтам Скарыны была выдадзена Ўрадам Беларускай Народнай Рэспублікі яшчэ ў 1918 годзе, ці першым годзе паўстання БНР, у серыі марак рэспублікі з надпісам "Беларусь Почта". Значыць маркай №1 у гісторыі Беларускай пошты ёсць марка з партрэтам Скарыны.




*Партрэт Францішка Скарыны. Марка выдадзена Ўрадам БНР у 1918 годзе. Беларуская паштовая марка №1.*

Вобраз доктара Скарыны ўзяты для яе з партрэту, змешчанага ў Бібліі ягонага выдання. Пад узорным ручніком, на якім Скарынаў герб – маладзік у сонцы – дададзены надпіс лацініцай: "Францішак Скарына з Полацку, 1517–1917". Але першым беларускім паштовым выданнем можа ганарыцца не філатэлія, а філакартыя. У 1917 годзе з нагоду 400-годдзя Беларускага кнігадрукавання Беларускім выдавецкім таварыствам у Вільні ў тыпаграфіі Марціна Кухты была выдадзена паштоўка з партрэтам Скарыны.




*Партрэт Францішка Скарыны. Паштоўка, выдадзеная Беларускім выдавецкім таварыствам Вільні ў тыпаграфіі Марціна Кухты ў 1917 годзе.*

Расейская акупацыя на доўгія гады перарвала выданне Беларускіх паштовых марак. У гэты ж час за межамі Беларусі, хоць і эпізадычна, але друкаваліся і ўводзіліся ва ўжытак маркі й іншыя паштовыя выданьні беларускай тэматыкі. З ліста Вітаўта Тумаша да Гая Пікарды ад 11 траўня 1971: “Маю дублікаты скарынінскае маркі Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне, на жаль, толькі колераў рудога й зялёнага, і тут іх Вам перасылаю. [...] Яны выдаваліся як паквітаваньне за ўплачаную складку ці за дадзеную ахвяру. Фактычны ініцыятар выданьня – тагачасны старшыня Цэнтралі БКС інж. Мікола Абрамчык. Рысункі для марак былі выкананыя ў Лодзі тамашнім сябрам БКС Зэнанам Зянкевічам. Маркі былі надрукаваныя ў 1942 г. у Бэрліне".




*Верхняя частка ліста сяброўскай легітымацыі сябра Беларускага камітэту самапомачы ў Нямеччыне за 1943 з Скарынаўскай маркай, выдаванымі за аплату сяброўскіх складак.*

Праз 30 год у 1973 у газеце «Беларус» з'явілася абвестка «Угодкі друку адзначаныя маркай» наступнага зместу: "Для ўшанаваньня 450-х угодкаў ад пачатку друку ў Беларусі Беларускі Інстытут Навукі й Мастацтва ў Нью Ёрку выдаў летась, у месяцы сьнежані, адмысловую юбілейную марку. Марка колеру вішнёвага, пасярэдзіне яе рэпрадукаваны патрэт Доктара Франьцішка Скарыны зь ягонае Бібліі. Патрэт абведзены арнамэнтаванай рамкай з надпісамі: «450-я ЎГОДКІ ДРУКУ Ў БЕЛАРУСІ. Др. Фр. СКАРЫНА, 1485? – 1540. МАЛАЯ ПАДАРОЖНАЯ КНІЖКА. ВІЛЬНЯ. 1522–1972». Графічнае афармленьне маркі мастака Барыса Данілюка. Марка выдадзеная лістамі, па 20 марак на кажным, з інфармацыйнымі даведкамі на лісьце пра ўгодкі друку ў Беларусі ў мовах ангельскай і беларускай…"




*Верхняя частка аркуша марак з партрэтам Скарыны,*
*выдадзеных у 1972 годзе да 450 –х угодкаў з пачатку друку на тэрыторыі Беларусі*
*стараннямі Вітаўта Тумаша*

Толькі 20 сакавіка 1992 года з'явілася першая марка Незалежнай Беларусі з выяваю крыжа Эўфрасіньні Полацкай. Але і ў Савецкім Саюзе, які 70 гадоў змагаўся з рэлігіяй, друкаваліся паштовыя выданні, прысвечаныя Скарыну. Так 3 жніўня 1967, у дзень 450-годдзя беларускага кнігадрукавання, пошта СССР адзначыла юбілей выпускам мастацкага канверта з гравюрай  з «Бібліі» 1517. Надпіс на канверце на беларускай і рускай мовах – «450 гадоў беларускай кнігадрукавання. Г. Скарына-заснавальнік друкавання кніг на беларускай мове».




*Канверт з партрэтам Францішка Скарыны, выдадзены поштай СССР у 1967 годзе*

Па рашэнню ЮНЕСКА ў 1990 адзначалася 500-годдзе з дня нараджэння Скарыны. Пошта СССР у 1988 адзначыла гэты юбілей выпускам буйнафарматнай маркі шматмільённым накладам. Мастак Іван Сушчанка адлюстраваў першадрукара перад лістамі рукапісу з пяром у руцэ. Партрэт Францішка Скарыны заключаны ў дэкаратыўную рамку. На марцы намаляваныя макет нябесных сфер і герб Скарыны - месяц і сонца (гэты знак сустракаецца на ўсіх пражскіх і віленскіх кнігах першадрукара).




*Канверт і марка з партрэтамі Францішка Скарыны, выдадзеныя поштай СССР (1988)*

Пасля абвяшчэння Незалежнасці чыноўнікі ад пошты амаль цэлы год карысталіся маркамі ўжо неіснуючай імперыі. Стаміўшыся чакаць беларускіх паштовых марак, у верасні 1991 Алесь Сярожкін з Воршы вырашыў зрабіць наддрукоўку «Беларусь» на марках СССР. Пасля некалькіх пробных наддрукоўак на розных марках СССР спыніўся на марцы з выявай Скарыны. Наддрукоўка рабілася ўручную чырвонай фарбай. Праз пошту прайшло не больш як 300 паасобнікаў. А ўсяго было 50 аркушаў па 21 марцы ў аркушы.




*Марка СССР 1988 года, прысвечаная 500-ым угодкам з дня нараджэння Францішка Скарыны з наддрукоўкай слова «Беларусь». Верасень 1991 года*

Нарэшце Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь таксама пачало прысвячаць Беларускаму першадрукару цікавыя выпускі. Гэта паштовыя маркі, канверты, спецыяльныя штэмпелі. Першая марка з гравюрай Скарыны Дыспут выдадзена Белпоштай у 1995 годзе на Дзень Беларускага пісьменства. Першапачаткова назва Дзень Беларускага пісьменства і друку – дзяржаўнае свята ў Рэспубліцы Беларусь, якое адзначаецца з 1994 года ў першую нядзелю верасня. Штогод свята ладзіцца ў новых гарадах з багатай гістарычнай спадчынай, даўніх цэнтрах асветы, культуры і кнігадрукавання.




*Дыспут. Гравюра з кнігі Францішка Скарыны «Ісус Сірахаў». Марка, выдадзеная поштай Беларусі ў 1995 годзе з нагоды Дня Беларускага пісьменства і друку*

Да 480-й гадавіны беларускага кнігадрукавання была выпушчаная цудоўная серыя буйнафарматных марак, аформленых мастаком Міколам Рыжым. Чатыры мініяцюры серыі апавядаюць аб розных перыядах жыцця і дзейнасці Францішка Скарыны. На марках намаляваныя старажытны Полацк-горад, дзе нарадзіўся Францішак Скарына; сярэднявечны Кракаў-месца вучобы асветніка; старадаўнія Прага і Вільня – гарады, дзе праходзіла выдавецкая дзейнасць першадрукара. На

№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

мініяцюрах – гравюра 1517, помнік ФранцішкуСкарыну ў Полацку, старонкі скарынаўскіх кніг – «Бібліі» і «Апостала», друкаваны станок і тэкст «480 гадоў Беларускага кнігадрукавання». Выдадзены таксама канверт «Першы дзень» з выявай старадаўняга друкарскага станка з юбілейным тэкстам на картушы. Малюнак вянчаюць літары «Ф. С». У дзень юбілею, 7 верасня 1997, на галоўнай пошце Менска праводзілася спецгашэнне. На юбілейным штэмпелі малюнак: на фоне герба Скарыны юбілейная дата, літары «Ф. С.» і тэкст «Р. А. «Белпошта» 7.09.97. Мінск-50. 480 гадоў беларускага кнігадрукавання".



*Канверты першага дня з юбілейнымі маркамі, выдадзеныя поштай Беларусі ў 1997 годзе*

У пятым стандартным выпуску ў 2001 поштай Беларусі была выдадзена марка Асабісты герб Францішка Скарыны (1517 г.). Не ўсе навукоўцы пагаджаюцца з гэтым. Існуюць меркаванні, што гэта выдавецка-друкарская марка Скарыны, і нават, што ў Францішка Скарыны гэты знак сімвалізуе Ісуса Хрыста– Сонца і Дзеву Марыю – Месяц, а ў больш шырокім сэнсе знак Скарыны можна расшыфраваць як сімвал веры або сімвал Бібліі.




*Асабісты герб Францішка Скарыны (1517 г.). Марка, выдадзеная поштай Беларусі ў 2001 годзе*

№.29, красавік 2022 ISSN 2562-950

Стала амаль традыцыяй выпускаць на Дзень Беларускага пісьменства канверты з малюнкам і маркіраваныя канверты, прысвечаныя святу, з скарынаўскай тэмай.




*Канверты пошты Беларусі, выдадзеныя з нагоды Дня Беларускага пісьменства ў 2003 годзе ў Полацку і ў 2006 годзе ў Паставах*

У 2005 годзе пошта Беларусі выпусціла ў зварот блок Архітэктура старажытнай Беларусі, на якім размешчаныя дзве маркі з выявамі Старога замку ў Гародні і Мірскага замку. Але на полі блоку выявы дэталяў аж двух гравюр Скарыны: фрагмент ілюстрацыі Тытульнага ліста 119 трэцяй Кнігі царстваў «Цар Саламон ставіць храм Богу ў Ерусаліме» і фрагмент ілюстрацыі Тытульнага ліста 183 чацвёртай Кнігі царстваў «Навуходаносар цар Вавілонскі здабывае Ерусалім».




*Архітэктура старажытнай Беларусі. Блок пошты Беларусі з гравюрамі Скарыны "Цар Саламон ставіць храм Богу ў Ерусаліме" і "Навуходаносар цар Вавілонскі здабывае Ерусалім", выдадзены ў 2005 годзе*

ISSN 2562-950

Ушаноўваючы мастака Аляксандра Кішчанку, пошта Беларусі ў 2008 выпусціла маркіраваны канверт з малюнкам мазаікі (1978) з партрэтам Скарыны.




*Мастацкі маркіраваны канверт «75 год са дня нараджэння Кішчанкі А. М.» (2008), ілюстрацыя – мазаіка на будынку ў мікрараёне Усход, г. Менск (1978)*

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савету Беларускай ССР № 2675-XI ад 20 красавіка 1989 года заснаваны Медаль Францішка Скарыны - дзяржаўная ўзнагарода Беларусі. Ізноў быў зацверджаны Законам Рэспублікі Беларусь ад 2 ліпеня 1997 года. У 1995 Пастановай Вярхоўнага Савету заснаваны Ордэн Францішка Скарыны, як адна з найвышэйшых дзяржаўных узнагародаў Беларусі за асаблівыя заслугі ў справе нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння.




*Ордэн і медаль Францішка Скарыны. Маркі пошты Беларусі (2008)*




*Канверты пошты Беларусі, выдадзеныя з нагоды Дня Беларускага пісьменства ў 2010 годзе ў Хойніках (маркіраваны канверт з відарысам тытульнай старонкі Бібліі на марцы) і ў 2017 годзе другі раз у Полацку*

16 красавіка 2015 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў зварот Канверт Першага Дня з застасаваннем спецгашэння адпаведным штэмпелем з гербам Францішка Скарыны. На марцы Францішак Скарына трымае ў руках Псалтыр - першую надрукаваную ім кнігу. На стылізаванай старонцы знакаміты тэкст з З прадмовы да «Кнігі Юдзіф»: «Як звяры, што блукаюць у пушчы, ад нараджэння ведаюць сховы свае, як птушкі, што лётаюць у паветры, помняць гнёзды свае, як рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае і як пчолы бароняць вуллі свае – гэтак і людзі да месца, дзе нарадзіліся і ўзгадаваны ў Бозе, вялікую ласку маюць». На канверце гравюры Полацку – дзе нарадзіўся першадрукар, Кракава – дзе ён вучыўся, Прагі – дзе распачаў друкаванне Бібліі і Вільні - дзе завершыў сваю друкарскую справу.




*Канверт першага дня (КПД) з паштовым блокам «525 гадоў з дня нараджэння Францішка Скарыны» і спецгашэннем*

500-годдзе Беларускага кнігадрукавання-дата сусветнай значнасці, унесеная ў спіс памятных дат ЮНЕСКА. Філатэлісты прапанавалі Выдавецкаму цэнтру «Марка» РУП «Белпошта» выдаць да юбілею марачны ліст з гравюрамі Скарыны. Але прапанова не была прынятая. Тады ініцыятыву на сябе ўзялі Міжнароднае грамадскае аб'яднанне Згуртаванне Беларусаў свету «Бацькаўшчына» і Беларускі Інстытут Навукі і Мастацтва (БІНіМ) у Нью-Ёрку. Гравюры былі надрукаваныя ў выглядзе ліста паштовых налепак для дадатковага наклейвання на канверт з звычайнай паштовай маркай.




*Гравюры з Біблії Скарыны. Ліст налепак, выдадзены ў 2017 годзе на сродкі Міжнароднага грамадскага аб'яднання Згуртаванне Беларусаў свету «Бацькаўшчына» і Беларускага Інстытуту Навукі і Мастацтва ў Нью-Ёрку*

Белпошта выпусціла паштовы блок. У аснове маркі – старонка з Псалтыру з гравюрай «Цар Давід звяртаецца з псалмамі да Бога Саваофа". На полі блоку

Скарына з кнігай "Песня цара Давыда еже славуть Псалтырь" каля друкарскага станка. У моры песень ёсць песні прысвечаныя Богу. Яны запісаныя ў Кнізе мудрасці – Псалтыру.




*500-годдзе Беларускага кнігадрукавання. Псалтыр.*
*Францішак Скарына. Блок пошты Беларусі, выдадзены ў 2017 годзе*

Напэўна гэты артыкул не можа быць закончаны пакуль будуць выдавацца паштовыя маркі. Бо нельга ўявіць, што марак, прысвечаных Францішку Скарыну, больш выдавацца не будзе. Наперадзе чарговыя юбілеі, мерапрыемствы і адкрыцці. Не так даўно мастаказнаўцы выказалі здагадку, што на знакамітай фрэсцы «Афінская школа» у бібліятэцы Ватыкану Рафаэль побач з сабой адлюстраваў менавіта Францішка Скарыну. У правым ніжнім куце меркавана намаляваны ў светлым галаўным уборы Францішак Скарына.




*Афінская школа (1510-1511). Рафаэль Санці (1483 – 1520). Музей: Станца дэла Сеньятура (Ватыкан).Блок пошты Тога, выдадзены ў 2014 годзе*

**Liavon Karpovich: Philatelistic Study of Skarina and His Activities**
*(webzine "**Kultura. Natsyja**", issue 29, April 2022, 98-110, www.sakavik.net)*

In spite of the outstanding nature of Francishak Skaryna's activities and accomplishments, he was first seriously mentioned and recognized in Belarus in the 1920's. Since then, Skaryna's life and educational activities have been highlighted in scientific publications, art, theatre and cinema productions. He has also been featured in various philatelistic miniatures. Only one article has been put forth dealing with the philatelistic life and activities of Skaryna – one written by philatelist Lev Kolasav, entitled *A Genius, Encrypted in Stamps*, and published in *Viestnik suviazi (No 3 (143) 2017*. One cannot say that this article is all-encompassing since it does not touch on emigrants' publications and those of latest years and in Russian-language publications. Thus, the author decided to open up the subject more widely and write it in Belarusian. The content of the article can interest collectors and those who maintain a rather haphazard attitude to the histories of countries, the life and activities of Francishak Skaryna and various research literature produced by Belarusian Diaspora.

**Лявон Карпович: Филателия и Скорина**
***(веб-журнал «Культура. Нация», вып. 29, апрель 2022, 98-110, www.sakavik.net )***
Несмотря на величие Франциска Скорины, в Беларуси о нем заговорили только в 1920-е годы. С тех пор его жизнь и просветительская деятельность нашли отражение в научных трудах, живописи, театре и кино, а также в художественном многообразии филателистической миниатюры. Но только одна статья известного филателиста Льва Коласова «Гений, зашифрованный в марках», опубликованная в «Вестнике связи» № 3 (143) 2017 г., посвящена Скорине. Данная статья является неполной, не охватывает эмиграцию и последние публикации и представлена на русском языке. Поэтому автор решил более полно раскрыть тему на беларусском языке. Содержание может быть интересно коллекционерам и тем, кто неравнодушен к истории страны, жизни и творчеству Франциска Скорины, некоторым направлениям деятельности беларусского зарубежья.